**З 846 удзельнікаў абласнога этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах у Гродзенскай вобласці гэта была сапраўды цудоўная пяцёрка. Пяць навучэнцаў здавалі экзамен па кітайскай мове.**

# Цудоўная пяцёрка

Чатыры замежныя мовы — англійская, нямецкая, французская, іспанская — аб'ядналі 132 удзельнікаў. А кітайскую мову сёлета здавалі пяць юных знаўцаў. Гэта больш чым удвая перавысіла паказчык мінулага года, калі кітайская мова як прадмет упершыню была ўведзена ў праграму рэспубліканскай алімпіяды, паведаміла метадыст Гродзенскага абласнога інстытута развіцця адукацыі старшыня прадметнага аргкамітэта абласнога этапу Рэспубліканскай алімпіяды па замежнай мове Ірына Тадэвушаўна Каскевіч. Тады ў Гродзенскай вобласці было двое ўдзельнікаў — Антон і Ганна Хэ. І ў гэтым годзе брат і сястра, якія вучацца ў Гродзенскай гарадской гімназіі, пацвердзілі свае веды і будуць прадстаўляць Гродзеншчыну на фінальным этапе алімпіяды.

Яшчэ трое юных удзельнікаў — навучэнцы 6 класа Гродзенскай гімназіі імя акадэміка Я.Ф.Карскага — адзначаны граматамі. Так што патэнцыял у вывучэнні гэтай замежнай мовы ў вобласці ёсць. І тут вялікая роля належыць настаўнікам кітайскай мовы, якую ў Гродзенскай гарадской гімназіі выкладае Наталля Валер'еўна Турок, а ў гімназіі імя Я.Ф.Карскага — Лю Сіньюань.

Словы ўдзячнасці настаўнікам, якія рыхтуюць удзельнікаў алімпіяд усіх узроўняў, не раз гучалі ў гэтыя дні. Напрыклад, трэнер па інфарматыцы Тадэвуш Вітольдавіч Макоўскі з Іўеўскага раёна падрыхтаваў трох пераможцаў: дыпломам І ступені адзначаны Юрый Свістун і Павел Барановіч, дыпломам ІІ ступені — Яўген Нехвядовіч. Усе яны вучацца ў Іўеўскай сярэдняй школе. Юрый Іосіфавіч Вільчэўскі з Воранаўскага раёна таксама падрыхтаваў трох дыпламантаў. Настаўніца замежнай мовы гімназіі № 1 Ліды Тамара Барысаўна Баярэнка штогод рыхтуе пераможцаў алімпіяд абласнога і рэспубліканскага ўзроўню. Вось і на гэты раз васьмікласніца Катрына Шрайбер адзначана дыпломам І ступені за лепшы вынік у алімпіядзе па нямецкай мове. Стабільна высокія вынікі па хіміі дэманструюць навучэнцы Гродзенскай гарадской гімназіі, якіх рыхтуе Віталь Тадэвушавіч Стаціна.

Найбольшую колькасць удзельнікаў — 96 чалавек — прадстаўляў прадмет "Матэматыка". Як адзначыла начальнік вучэбна-метадычнага аддзела Гродзенскага абласнога інстытута развіцця адукацыі старшыня прадметнага аргкамітэта абласнога этапу Рэспубліканскай алімпіяды па матэматыцы Валянціна Іванаўна Лукашык, чарговы раз бліскучыя вынікі паказалі навучэнцы гімназій Шчучына Андрэй Асанаў і № 1 Ліды Уладзіслаў Казлоўскі, Кацярына Кунц з сярэдняй школы № 3 Ашмян, якія адзначаны дыпломамі І ступені.

— Усяго па выніках абласнога этапу рэспубліканскай алімпіяды па 17 вучэбных прадметах уручана 375 дыпломаў, — расказала галоўны спецыяліст упраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Ларыса Пятроўна Губіч. — Лідарамі па колькасці ўзнагарод з'яўляюцца ўстановы адукацыі Кастрычніцкага раёна Гродна — 79 дыпломаў, Ліды — 75 і Ленінскага раёна Гродна — 61 дыплом. Палепшылі вынікі навучэнцы Навагрудскага, Шчучынскага, Астравецкага, Воранаўскага, Мастоўскага, Слонімскага раёнаў.

Сярод навучальных устаноў некалькі гадоў запар лепшы вынік паказвае гімназія № 1 Ліды (дырэктар Наталля Андрэеўна Зайцава). У гэтым годзе яе навучэнцы атрымалі 37 дыпломаў. 29 дыпломаў — у навучэнцаў Гродзенскай гімназіі імя акадэміка Я.Ф.Карскага (дырэктар Барыс Аляксандравіч Сяброўскі), 27 заваявалі прадстаўнікі Гродзенскай гарадской гімназіі (дырэктар Ганна Міхайлаўна Дулуб).

Алімпіяды праводзіліся ва ўстановах адукацыі Гродна, Скідзельскім сельскагаспадарчым ліцэі і ўпершыню — у абласным інстытуце развіцця адукацыі. Адкрыццё і падвядзенне вынікаў алімпіяд праходзіла ўрачыста, з музычнымі нумарамі і віншаваннямі, у цёплай атмасферы добразычлівасці і падтрымкі ўдзельнікаў. Такую добрую арганізацыю адзначылі кіраўнікі раённых каманд.

Завяршыўся абласны этап алімпіяды, наперадзе самы адказны — заключны. Ужо складзены графік збораў, вызначаны трэнеры. А Гродна рыхтуецца да адказнай місіі — прыняць удзельнікаў чацвёртага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па гісторыі і грамадазнаўстве.

**Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ.**
*grodna@ng-press.by*